■ Людзі і лёсы

# «ГЭТА ВЕЛЬМІ ВАЖНА, КАЛІ ЛЮБЯЦЬ ТОЛЬКІ ЦЯБЕ»

**Брыльянтавае вяселле, шасцідзесяцігоддзе сумеснага жыцця адзначылі нядаўна сужэнцы ГРАМЫКІ з вёскі Цяснова Глускага раёна. Гэта важна — колькі пражыць, але яшчэ важней як...**

Вось яна, хата, складзеная на гладкі вугал, вось яны прыветлівыя, гасцінныя гаспадары.

— Мы неяк заўсёды з усмешкай, з пазітыўным настроем, — кажа Міхаіл Фёдаравіч. — Можа, таму і дажылі да гэтага юбілею... Нейкія сваркі, вядома ж, былі, але не такія, каб да боек ці хто ў прочкі бегаў. Нейкі час, здаралася, не размаўлялі. Я ад сваёй Ніны мог пачуць за дзень толькі: «Ідзі есці» (ежу яна заўжды гатавала). А потым — «немцы ў хаце» канчаліся... Я ўжо і не помню, хто першы на міравую ішоў. Мусіць, я, бо вельмі ж не люблю ў маўчанку гуляць... Жыццё, брат, пражыць — не лапці сплесці.

Падчас нашай размовы гаспадар не раз паўтараў гэтую прымаўку і сапраўдны сэнс яе, трэба разумець, ведаў.

Маленства яго прайшло на хутары Вышкі.

— У Веснаве, у адной з вёсак раёна, быў пан Быкоўскі. У яго некалі наш бацька купіў 20 дзесяцін зямлі *(адна дзесяціна — 1,09 гектара. — **Аўт.**)*. З іх мы і жылі, — успамінае Міхаіл Фёдаравіч. — Сям'я вялікая, я ў ёй апошнім, дзясятым, дзіцем быў... Дык вось, пабудавалі мы хату, каб пракарміцца, сталі трымаць многа рознай жыўнасці. А ў 1939 годзе паступіла каманда ўсе хутары пасцягваць у вёскі. Што ж, яно ўладам, можа, і відней? Але ж наша сям'я трымалася да апошняга... Прыслалі ўрэшце некалькі мужчын — каго з ломікам, каго з каламі — сталі заганяць іх паміж бярвёнамі ды бурыць хату. Нам нічога не заставалася, як пераехаць у Цяснова.

Малы Міша тады, вядома ж, не думаў, што менавіта тут, у гэтай вёсцы, сустрэне свой лёс, бо хата Ніціных бацькоў была на той жа вуліцы.

— У вёсках усе людзі знаёмыя. Я ведаў, што жыве такая дзяўчына, — згадвае Міхаіл Фёдаравіч. — Можа б, і пазнаёміўся з ёй яшчэ да арміі, але ж... Дзе звычайна збіралася моладзь? На танцах. А я туды ніколі не хадзіў — у мяне нармальных штаноў не было, а ў палатняных у людзі ж не выйдзеш — засмяюць. Сапраўдным кавалерам я адчуў сябе пасля войска.


Фота Сяргея РУДЗІНСКАГА.

Служыць Міхаілу Фёдаравічу давялося за мяжой, у Германіі. Задачай іх батальёна было ахоўваць электрастанцыю, дзе працавала 24 тысячы чалавек. За гэта салдатам наваt грошы плацілі — 35 марак у месяц. Той, хто не піў, не курыў, мог нешта сэканоміць, каб перад ад'ездам накупляць сабе рознага дэфіцыту.

— Першы касцюм я ў Глуску шыў, — успамінае Міхаіл Фёдаравіч. — Краўцом (як зараз помню) быў Юрэй. Я паказаў яму адрэз тканіны. А вось грошай, каб заплаціць за пашыў, тады не меў. Замест іх прапанаваў прывезены з Германіі абрус. Убачыла яго дачка краўца, Фаня, і ўгаварыла бацьку, каб ён згадзіўся. Так я займеў касцюм, ды яшчэ і на падкладцы... Прыбраўся, начапіў гадзіннік «Победа», які таксама вымяняў на абрус на вакзале ў Мінску, і з'явіўся на танцах... Ніна прыглянулася мне адразу — вясёлая, зграбная...

Ёй гэты прыгажун спадабаўся таксама. А інакш як растлумачыць той факт, што яна, чатыры гады адсябраваўшы з адным хлопцам, можна сказаць, у адно імгненне памяняла яго на Міхаіла.

— Вяселле гулялі тры дні, — успамінае Ніна Фёдараўна. — Пасля вянчання ў Свята-Богаяўленскай царкве ў Глуску вечар гасцявалі ў нас. Назаўтра — перайшлі ў хату жаніха, а на трэці дзень — кожны частаваў сваіх гасцей. Я была шчаслівая, што выйшла за такога хлопца. Ён аказаўся добрым мужам. Сваімі рукамі пабудаваў вось гэтую хату. (Дарэчы, некалі тут стаяла хата бацькоў. Дык мой гаспадар і цяпер, бывае, кпіць: маўляў, вунь тваё паселішча, за сцяной... Але ж я ведаю, што ён жартуе...) Галоўнае, што ён мяне ніколі не зневажаў, што ў нас не было здрад. Гэта вельмі важна, калі любяць толькі цябе.

У Цяснове сям'я Міхаіла Фёдаравіча і Ніны Фёдараўны лічылася і лічыцца працавітай. Сужэнцы змоладу не цураліся ніякай работы. Гадуючы чацвярых дзяцей, гаспадыня, як яна кажа, зарабіла на свінаферме персанальную пенсію. І на падворку заўжды трымалі па дзве каровы, па пяць свіней, статкамі — курэй, гусей... Адных толькі падушак Ніна Фёдараўна зрабіла больш за 15 штук!

І цяпер, калі абодвум за восемдзесят, сужэнцы яшчэ трымаюць каня — для душы, для асабістых патрэб і каб не сядзець без справы. У хаце таксама кот з вельмі трапнай мянушкай Бурмалей — гладкі такі, спаважны, дагледжаны.

...На брыльянтавым вяселлі ў хаце Грамыкаў было шумна і весела. «Маладых» віншавалі дзеці, дзевяць унукаў, восем праўнукаў. «Мы багатыя», — прызнаюцца яны і маюць рацыю. Бо іх багацце — самае сапраўднае: нашчадкі, якім яны далі жыццё, ды шчырыя адносіны адзін да аднаго, якія яны пранеслі праз дзесяцігоддзі.

**Вольга ЧУЧВАЛ**

■

■ Ёсць пытанне

# У ЦЕСНАЦЕ? У КРЫЎДЗЕ...

**Яшчэ некалькі месяцаў таму цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа Барысаў-Мінск, адпраўленнем у 6.30, мелі па 10 вагонаў, і ездзіць на іх было зручна. Цяпер яны сталі карацейшымі.**

**Як растлумачылі мне на станцыі «Барысаў», кіраўніцтва чыгункі вырашыла адчапіць пару вагонаў дзеля эканоміі, «у сувязі са скарачэннем пасажырапатоку».**

Тэарэтычна ён і сапраўды павінен быў зменшыцца, бо скончыўся дачны сезон. Але ж на самай справе тых, хто з Барысава, з іншых вёсак ды мястэчкаў, з найбліжэйшых да сталіцы гарадоў, ездзіў у Мінск на працу альбо на заняткі ў навучальныя ўстановы, меней не стала.

Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова зайсці ў электрычку, напрыклад, на станцыі «Зарэчная» і потым прайсціся па вагонах. Месца, каб недзе прыткнуцца і сесці, ужо дакладна не знойдзеце. Прыйдзецца ехаць стоячы, прычым, здараецца, ад Жодзіна і Смалявічаў — яшчэ і ў цеснаце.

А гэта значыць — у крыўдзе.

Зрэшты, зразумець кіраўніцтва чыгункі можна: з Мінска ў Барысаў гэтая электрычка адпраўляецца вельмі рана і таму ідзе, можна сказаць, пустая — пасажырапаток і сапраўды мізэрны... Але ж на зваротным шляху колькасць пасажыраў у дзясяткі разоў узрастае. На гэтай зручнай па часе адпраўлення і, так бы мовіць, хуткаснай электрычцы едуць жанчыны, якія з раніцы ўжо сабралі дзяцей у школы, дагледзелі гаспадарку, едуць людзі сталага ўзросту, едуць хворыя на кансультацыі ці лячэнне ў сталіцу, едуць урэшце тыя, хто потым цэлы дзень будзе на нагах — класці цэглу на той жа будоўлі альбо стаяць за прылаўкам...

Вось і атрымліваецца, што эканомячы на паражняку, наша чыгунка эканоміць на камфорце і зручнасці для сваіх пасажыраў.

Ці эканом-клас на тое і эканом, каб на ім эканоміць?

**Анатоль Мазгоў,**

*г. Барысаў*

■

■ Чалавек чалавеку

# Браткоўскі — сын Браткоўскіх

**Амаль усё сваё свядомае жыццё гэта сям'я прысвяціла служэнню людзям: Уладзімір Васільевіч Браткоўскі — вядомы хірург, Алена Васільеўна — урач-педыятр.**

Не дзіва, што па іх жа слядах пасля школы пайшоў сын Сяргей: паступіў у Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт, скончыў інтэрнатуру, па размеркаванні трапіў у сваю ж Любчанскую бальніцу. Працаваў урачом, загадчыкам паліклінікі.

Пры ім тут змяніліся не толькі метады лячэння, але і абсталяванне, мадэрнізаваны другі паверх тэрапеўтычнага корпуса, адрамантавана паліклініка, у планах — рамонт бальніцы.

Тры гады таму Сяргей Уладзіміравіч Браткоўскі ўзначаліў яе і пацяперашняму ў любы час сутак, у любое надвор'е спяшаецца на дапамогу людзям...

**Ілья Антончык,**

*г. Навагрудак*

■

■ Прапанова

# Гісторыя на крылах

**Што мы ведаем пра Нарвегію? Пакуль не надта шмат: чулі нешта пра Осла, пра фіёрды, пра тое, што іх знакаміты біятланіст Б'ёрндален пабраўся шлюбам з нашай зоркай Дар'яй Домрачавай...**

Але ж гэта маленькая краіна ганарыцца сваёй гісторыяй і імкнецца да таго, каб пра яе даведалася як мага больш людзей. На кожным з іх самалётаў — вывы выдатных землякоў: нарвежскіх паэтаў, палітыкаў, змагароў за свабоду, навукоўцаў... І ўсе яны «падарожнічаюць» па свеце.

Я куды хілю? Нашы самалёты таксама шмат дзе бываюць... А значыць, маглі б і яны несці на крылах інфармацыю пра Беларусь.

Цікава, ад каго гэта залежыць?

**Наталля Ружыцкая**

■

ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY

■ Зачапіла

Рэверс з сеціва

## І. АСТАШКЕВІЧ.
### Марная МЭТА?
*(«Звязда» ад 6 снежня.)*

— Калісьці радыё было адзіным сродкам масавай інфармацыі, праз які мы даведваліся пра тое, што адбываецца ў краіне і свеце. Прыёмнічак у нас стаяў на падаконніку, і маці заўсёды накрывала яго вышытай сурвэткай. Потым так жа беражна мы адносіліся да першых тэлевізараў. Для іх нават спецыяльныя покрыўкі былі — каб абараніць ад пылу.

І цяпер часам на кухні хочацца паслухаць радыё, але ж прыёмнік, куплены пасля адключэння праваднога, не занадта зручны, хоць быццам і просты. Каб ён працаваў, прыйшлося прыладзіць нейкі дроцік для лепшага прыёму. Але ж чутна зусім не так добра, як калісьці, асабліва, калі нехта побач праходзіць.

А радыё я ўсё роўна люблю: яно стварае настрой на ўвесь дзень, і ўвогуле, калі працуе, здаецца, што ў доме нехта, акрамя мяне, ёсць. Слухаю і навіны, і вядучых, і музыку. Асабліва люблю песні часоў маёй маладосці — сярэдзіны мінулага стагоддзя. І яшчэ прыемныя гутаркі з цікавымі людзьмі падабаюцца. Важна, каб у эфіры былі перадачы, якія пашыраюць кругагляд і расказваюць пра нешта добрае і чыстае.

**Ніна Васільеўна Жывадзёрава,** г. *Слаўгарад.*

## І. СІДАРОК.
### «Сын, украдзены ўласным татам»
*(«Звязда» ад 17 снежня.)*

— Мая дачка ў студэнцтве сустракалася з іранцам па імені Махмуд. Мяне гэтыя адносіны не напружвалі. Добры хлопец, вучыўся ў нас у Мінску на стаматолага. Ён быў на апошнім курсе, збіраўся ехаць жыць і працаваць у Канаду, клікаў з сабой маю Жэню. Яна тады толькі ва ўніверсітэт паступіла. Не паехала, казала, што трэба атрымаць адукацыю. Ён яшчэ колькі разоў пазваніў і знік, а казаў — кахаю... Я гэта да чаго. Думаецца мне, што адносіны са сваімі людзьмі ўсё ж больш зразумелыя і прадказальныя. Гісторыя, выкладзеная ў артыкуле, нешта зачапіла ў сэрцы. Абмяркоўвалі яе з суседкай. Дык яна сказала: «Што за бяда. Усходнія мужчыны дзяцей любяць, яму з бацькам добра будзе. А яна сабе новага народзіць...» Прыкра стала ад такіх слоў, але, думаю, ёй можна прабачыць, бо сваіх дзетак ніколі не мела. Тым не менш, здаецца мне, не ўсё так адназначна тут. Пэўна, не ўсё так добра было ў іх сям'і — не ў адзін жа дзень бацька сарваўся і паляцеў невядома куды. І маці трэба было б пяць разоў падумаць, перш чым выходзіць за іншаземца! Хаця па-жаночаму іх вельмі шкада, і хочацца, каб дзіця да маці вярнулася. Як ні кажы, гэта самы родны чалавек. Тым больш ён яшчэ надта малы, каб сказаць, дзе і з кім яму добра. І незразумела, чаму адпаведныя інстанцыі так марудна рэагуюць, што звезлі маленькага грамадзяніна, беларуса. Хочацца пачытаць, чым гісторыя скончыцца.

**Паліна Міхайлаўна,** *пенсіянерка-мінчанка.*

## С. ЯСКЕВІЧ.
### «Як стары дом аграсядзібай стаў»
*(«Звязда» ад 21 снежня.)*

— Цікава было прачытаць, як гаспадары з Камянецкага раёна сядзібу ўладкоўвалі. І я жадаю ім усяляких поспехаў. Але мяне зачапіў радок пра, мякка кажучы, неспакойных пастаяльцаў. А вы ведаеце, што такіх сярод патэнцыйных турыстаў аграсядзіб амаль добрая палавіна?



Я таксама спрабавала пачаць сваю справу ў дзедаўскім доме, толькі не ў пушчы, а ў глыбіні Палесся. І дом мы адрамантавалі, і ручнікоў-вышыванак у бабуль з навакольных вёсак сабралі. З першых турыстаў зусім малыя грошы бралі, толькі каб пакрыць расходы. А потым як прарвала: паехалі кампаніі, якім не толькі п'янкі і лазня, але і феерверкі патрэбныя былі сярод ночы. Дайшло да таго, што яны кідалі доларавыя купюры і патрабавалі, каб я знаходзіла дзяўчат, маўляў, жаданне кліента — закон для гаспадара. Ну а суседзі пасля начных абстрэлаў петардамі сталі выклікаць міліцыю. Цяпер мы выкарыстоўваем свой вясковы дом у якасці дачы. Летам адпачываем там сваёй сям'ёй і не нарадуемся.

**Аксана К.,** *Брэсцкая вобласць.*

## В. ШКЛЕННІК.
### «Каб ёлка не сапсавала свята»
*(«Звязда» ад 21 снежня.)*

— Хачу даць параду — не набывайце вялікую ёлку, калі ў вашым доме ёсць свойскія жывёлы. Бо мой кот, напрыклад, вельмі не любіў, калі ў кватэры з'яўлялася зялёная прыгажуня. І калі адну зіму яшчэ ўдавалася яго адганяць ад дрэва, то незадоўга перад мінулым Новым годам гэты падшыванец ёлку ўсё ж скінуў са стала. Прычым з уключанай гірляндай! Грукату было, канешне... Добра яшчэ, што без пажару абышлося.

**Ганна,** *г. Шчучын.*